Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэткультуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
__________________А. А. Корбут
«_____»____________ 2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/ вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДЫЯЛОГ КУЛЬТУР У КАНТЭКСЦЕ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыіпа вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01Культуралогія*
*(фундаментальная),спецыялізацыі*
*1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

2016

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-21 04 01-2013 па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках) івучэбнага плана па спецыяльнасці1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),рэг. № Д 21-1-15/13вуч. ад 27.06.2013

**СКЛАДАЛЬНІК:**
*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*С. У. Данскіх,* загадчык кафедры турызму і культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы», кандыдат культуралогіі, дацэнт;
*А. Э. Салікаў,* дацэнт кафедры маладзёжнай палітыкі дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол№ 9ад 25.03.2015);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол№ 2ад21.12.2015)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. І. Смолік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Сусветная культура ўяўляе сабой складанае, шматузроўневае, супярэчлівае ўтварэнне, якое ўплывае на ўладкаванне грамадства на велізарнай геакультурнай прасторы. У XXI ст., нягледзячы на відавочную тэндэнцыю сацыякультурнай дыферэнцыяцыі розных грамадстваў, інтэгратыўныя працэсы набылі вызначальны характар. Асабліва інтэнсіўна адбываюцца працэсы шматаспектнай арыентацыі на заходнееўрапейскую цывілізацыю. Глабалізацыя пранікае ў самыя глыбіні сацыяльных структур і кардынальна трансфармуе іх сутнасць на ўзроўні сям'і, звычаяў, каштоўнасцей, стэрэатыпаў, эстэтычных густаў і да т. п. Ідзе працэс фарміравання новай канцэпцыі рацыянальнасці, дзе ў якасці дамінуючых сцвярджаюцца прынцыпы культурнага плюралізму, рэлятывізму і камплімéнтарнасці.

Полікультурнасць з'яўляецца важнейшай адметнасцю сучаснай эпохі. Пры гэтым трэба мець на ўвазе, што полікультурнасць прадугледжвае паралельна з глабальнай культурай існаванне і развіццё моцных этнічных і нацыянальных культур, якія павінны ўзаемадзейнічаць на роўных, без уніфікацыі і сцірання культурных меж на фоне агульных працэсаў глабалізацыі. Культуры і іх суб'екты павінны знаходзіцца ў актыўнымдыялогу, гарманічнай міжкультурнай камунікацыі. А ён магчымы пры ўмове, калі нацыянальныя культурныя традыцыі і мовы, аўтахтонныя народныя культуры будуць прызнаны ў якасці безумоўных каштоўнасцей не толькі ўнутры кожнай нацыянальнай дзяржавы, але і ў межах іх раўнапраўнага дыялогу і міжкультурнага ўзаемадзеяння.

У гуманітарных навуках, у тым ліку і культуралогіі, праблема актуалізавалася на мяжы XIX–XX стст., а прадметна-функцыянальнае вывучэнне – у сярэдзіне мінулага стагоддзя. У сувязі з гэтым правамерна азнаёміць будучых даследчыкаў феноменаў культуры з парадоксамі дыялогу ў сусветнай навуковай думцы, увесці іх у катэгарыяльны аспект, раскрыць культуралагічны сэнс дыялогу, паказаць яго антыэнтрапійную сутнасць.Матэрыял дадзенага вучэбнага курса дазволіць студэнтам засвоіць сістэмныя каардынаты дыялогу ў сучаснай сусветнай культуры, зразумець тыпалагічныя адрозненні дыялогу і камунікацыі, авалодаць працэсам тыпалагізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыялагічных адносін, выявіць метамарфозы дыялогу ў перыяд мадэрнізацыі беларускага грамадства.

У працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны, згодна патрабаванням адукацыйнага стандарту, студэнты павінны атрымаць наступныя кампетэнцыі.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі ў галіне культуралогіі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-7. З павагай і беражліва ставіцца да гістарычнай спадчыны і культурныхтрадыцый, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні.

САК-9. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-1. Далучаць розныя групы насельніцтва і асобных індывідаў да працэсустварэння, засваення, зберажэння і распаўсюджання каштоўнасцей культуры.

ПК-2. Выкарыстоўваць нарматыўна-прававую базу галіны культуры.

ПК-4. Ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сферы культуры імастацтваў.

ПК-7. Займацца навукова-даследчай дзейнасцю ў галіне культуралогіі.

ПК-8. Аналізаваць і ацэньваць сабраныя звесткі.

ПК-9. Арганізоўваць сваю працу на навуковай аснове, валодаць камп’ютарнымиметадамі збору, захавання і апрацоўкі інфармацыі ў сферы прафесійнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – фарміраванне ў студэнтаў навуковага асэнсавання дыялогу як падмурка культуралагічнай парадыгмы XXI ст., раскрыццё ролі і месца міжкультурнага дыялогу ў вырашэнні глабальных праблем сучаснай цывілізацыі.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– садзейнічаць асэнсаванню ўсеагульных заканамернасцейфункцыянавання нацыянальных культур у кантэксце іх узаемадзеяння з іншымі культурамі;

– выявіць дынаміку паняцця «дыялог» у храналагічнай гарызанталі і сэнсавай вертыкалі сусветнай культуры;

– абазначыць якасці дыялогу як метаду пазнання;

– раскрыць дыялагічную сутнасць мяжы і асаблівасці памежнага быцця Беларусі паміж полюсамі Усходу і Захаду;

– паказаць дыялог як канструктыўны механізм культурагенезу.

У выніку вывучэння дадзенайвучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– сутнасць і вызначэнне дыялогу, яго катэгарыяльны аспект;

– тыпалагічныя адрозненні дыялогу і камунікацыі;

– узаемныя напружанні дыялогу і маналога ў структурным лабірынце мастацкай культуры;

– дыялагічную сутнасць важнейшых праяўленняў духоўназмястоўнай канстанты сістэмы культуры;

– патэнцыял дыялогу ў аксіялагічнай культуры асобы;

– трыядную аснову мадэлі дыялогу: універсальны прынцып фарміравання цэласнасці;

– узроўні ажыццяўлення міжкультурнага дыялогу ў кантэксце глабалізацыі;

– сферы міжкультурнага дыялогу;

– праблемы дыялагізму, якія вынікаюць з сучасных глабалізацыйных працэсаў;

– сутнасць дыялогу ў Беларусі і Беларусі ў дыялогу;

*умець*:

– асэнсоўваць ўсеагульныя заканамернасці функцыянавання нацыянальных культур у кантэксце іх узаемадзеяння з іншымі культурамі;

– паказаць дыялог як канструктыўны механізм культурагенезу;

– абазначаць якасці дыялогу як метаду пазнання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*валодаць:*

– ведамі па фарміраванні спецыфікі дыялагічных адносін культуры ў кантэксце сучаснай глабалізацыі;

– ведамі аб спецыфіцы суіснавання розных культур;

– ведамі аб правядзенні і ажыццяўленні палітычнай талерантнасці ва ўзаемаадносінах узаемадзейных культур ва ўмовах пашырэння міграцыйнай прасторы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны«Дыялог культур у кантэксце глабалізацыі»ўсяго прадугледжана 116 гадзін, з якіх 52 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 28 гадзін, семінары– 24гадзіны.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Месца вучэбнага курса «Дыялог культур у кантэксце глабалізацыі» ў фарміраванні асобасна-прафесійнай кампетэнтнасці, навыкаў і ўменняў, якія неабходны культуролагу-даследчыку. Прадмет, змест, мэта і задачы, структура вучэбнага курса. Міжпрадметныя сувязі дадзенай дысцыпліны. Віды вучэбных заняткаўі самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Крыніцы інфармацыі па праблематыцы вучэбнай дысцыпліны. Формы кантролю. Характарыстыка асноўных катэгорый дыялогікі як сукупнасці канцэпцый аб міжкультурным дыялогу. Разнастайнасць паняцця «дыялог». Метады даследаванняў сутнасці і зместу дыялогу.

### *Тэма 1. Дыялог як падмурак гуманітарнай парадыгмы сучаснай культуры*

Разнастайнасць культур як адметнасць сусветнай культурнай прасторы. Усеагульны характар працэсу распаду цэласнасці свету. Дваякасць артэфактаў культуры. Палярнасць культуры і яе архетыповы характар.

Бінарны архетып як унікальны лагічны падтэкст сусветнай культуры. Варыянты бінарнага дыскурсу духоўнага вопыту чалавецтва. Фундаментальны дуалізм уяўленняў аб свеце. Бесперапыннасць самаруху як якасная характарыстыка быцця чалавека і культуры.

### *Тэма 2. Станаўленне парадыгмы цэласнасці культуры ў глабальных супярэчнасцях сусветнай культуры XX–XXI стст.*

Семантыка і тыпалогія крызісу культуры як маркёра культурна-гістарычнай пераходнасці. Адмаўленне агульначалавечых каранёў у сусветнай культуры прадстаўнікамі «еўразійства». Крызісны характар XIX–XX стст. Сістэмнае гісторыка-тыпалагічнае вывучэнне і ацэнка крызісу культуры (М. Бубер, М. Каган, О. Мандэльштам і інш.).

Два шляхі развіцця сусветнай культуры: «уніз», да масавай культуры; «уверх», да сцвярджэння халістычнай ідэі (цэласнасці) культуры. Канструктыўны характар хаосу: стварэнне перадумоў і магчымасцей для новага этапу эвалюцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Узнікненне ідэі дыялогу ў гуманітарных навуках XX ст. (У. Біблер, М. Бахцін, Л. Баткін, Ю. Лотман, К. Ясперс і інш.).

*Тэма 3. Дыялог як з'ява і сутнасць*

Гісторыя дыялогу культур. Дынаміка паняцця «дыялог» у храналагічнай гарызанталі і сэнсавай вертыкалі сусветнай культуры (Ю. Брамлей, Л. Гумілёў, І. Кон, Д. Ліхачоў, П. Рапапорт і інш.). Функцыянаванне дыялогу ў розных формах, відах і кантэкстах.

Элементы дыялагізму ў маналагічнай культуры Сярэдневякоўя. Дыялагічнасць як унутраная ўласцівасць эпохі Адраджэння. Формы дыялагічных адносін у эпоху Асветніцтва. Парадокс дыялагічных адносін у XIX ст. Перамяшчэнне дыялогу ва ўнутраныя межы суб'ектаў культуры. Асэнсаванне немагчымасці «жыцця з іншымі»ў пачатку XX ст. (Ж. П. Сартр).

Станаўленне ідэі адносін «чалавека з чалавекам»як фундаментальнага факта чалавечай экзістэнцыі ў сярэдзіне XX ст.

*Тэма 4. Канцэпцыя дыялагічнага персаналізму М. Бубера*

Асэнсаванне М. Буберам двух тыпаў міжасобасных адносін. Асваенне стасункаў «Я і Ты». «Дваякасць» апазіцыі Я і Ты. Дэфіцыт цывілізаваных стасункаў і даверлівага дыялогу ў XX ст.Пазнанне сутнасці суб'екта культуры праз жывыя кантакты. Існаванне света культуры на адносінах «Я і Яно» і «Я і Ты». Безасабовыя аспекты быцця-разам-з-іншымі. Крытыка светасузірання адзіночкі, які не здольны выйсці за межы сваёй адасобленасці. Высвятленне адносін света і Бога, чалавека і Бога.

*Тэма 5. Рацыянальная прырода дыялогу У. Біблера*

Усеагульны сэнс дыялогу. Прысутнасць дыялогу ў гістарычнай прасторы кожнай культуры ў сферы розуму. Дыялог як аснова ўсіх вызначэнняў быцця чалавека. Інтэрпрэтацыя культуры як бясконцага дыялогу, асобай формы зносін паміж культурамі. Новы ўсеагульны розум – розум дыялагічны. XX ст. і дыялагічны сэнс культуры. Палілог як новая версія дыялогу. Логіка дыялогу культур. Логіка дыялогу логікі.

*Тэма 6. Асновы тэорыі дыялагізму М. Бахціна*

Пераадоленне М. Бахціным маналагічнага светаўспрымання ў сферы філалагічных і эстэтычных даследаванняў. Дыялог –



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

базавае паняцце мовазнаўства і літаратуры. Філасофска-этычны і лінгвасеміятычны аспект стасункаў суб'ектаў культуры. Дыялог як асобая парадыгма гуманітарных ведаў. Дыялагічная сутнасць пазнання.

### *Тэма 7. Асэнсаванне дыялогу ў катэгарыяльным аспекце М. Каганам*

Сістэмны падыход М. Кагана да сутнасці і зместу дыялогу. Два тыпы міжкультурных узаемадзеянняў: адносіны суб'екта да аб'екта; адносіны паміж суб'ектамі культуры. Камунікацыя і дыялог: агульнае і living рознае. Аднамернасць і асіметрычнасць камунікацыі.

Дыяхранічнае вымярэнне своеасаблівасці быцця дыялогу ў культуры. Тыпы міжкультурных узаемадзеянняў у структурна-функцыянальным аспекце: негатыўны, агрэсіўны, уніжаны, зацікаўлены. Аналіз культуры ў дыялектычным параўнанні з маналагічнымі тыпамі ўзаемаадносін.

### *Тэма 8. Культуралагічны сэнс дыялогу ў архетыпах дуады і трыяды*

Узроўні лічбавай сімволікі: канкрэтна-апісальны, абагульнены. Лічбавыя выражэнні дыялогу і камунікацыі. Прынцыпы дваякасці і траякасці ў карціне свету чалавека на розных этапах культурагенезу. Лічба два як прынцып супрацьпастаўлення і падзелу. Дуалізм светапогляднай парадыгмы XX ст. Першаснасць камунікацыі над дыялогам у культуры XX ст.

Трыядныя матывы і вобразы ў сэнсавай прасторы мікра- і макракосмасу. Сістэмная трыяда як універсальная мадэлюючая структура.Тры як сімвал духоўнага сінтэзу. Трыядны сінтэз як галоўны механізм узнаўлення міжкультурных узаемадзеянняў у XXI ст.

### *Тэма 9. Тыпалагічныя асаблівасці дыялагічных адносін у сістэме сусветнай культуры*

Выяўленне якасцей суб'ектыўнасці традыцыйных і дынамічных культур у сферы міжкультурнага дыялогу. «Зоны ўзмоцненых кантактаў» у перыяд станаўлення пераходных культур. Пашырэнне поля і форм дыялогу ў канцэпцыі Э. Маркарана.

Тыпы дыялогу ў кантэксце міжэтнічных кантактаў паводле Л. Гумілёва: суіснаванне, асіміляцыя, метысацыя, зліццё. Тыпы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзаемаадносін суб'ектаў культуры ў канцэпцыі Л. Карсавіна: развіццё, змяненне, прагрэс.

Суб'ект-суб'ектная прырода як асноўная тыпалагічная рыса дыялагічных адносін.Тры ўзроўні праяўлення якасцей суб'ектыўнасці. Тыпы магчымых варыянтаў узаемадзеяння суб'ектаў культуры паводле Ю. Лотмана («Культура і выбух»).

### *Тэма 10. Узаемадзеянне нацыянальных культур у эпоху глабалізацыі*

Суадносіны паміж «цэнтрам» і мноствам «перыферыйных» і «паўперыферыйных» сацыякультурных сістэм. Асноўныя канструкцыі ўзаемаадносін этнанацыянальных культур з тэхнагеннай заходняй цывілізацыяй: сімбіёз, канфлікт, сінтэз.

Наступствы глабалізацыі ў сферы этнанацыянальных культур: распад традыцыйных маральных каштоўнасцей; узнікненне вялікіх дыспрапорцый паміж высокай і масавай культурай; карнавалізацыя культуры; страта індывідуальнага сэнсу і зместу нацыянальных культур; пераўтварэнне ў перманентную мазаіку візуальных вобразаў і сімвалаў кліпавай свядомасці.

Дыялагічная сутнасць беларускага культурнага памежжа. Тыпы ўзаемаадносін на мяжы: маналог, дыялог.

### *Тэма 11. Культурны рэлятывізм і яго значэнне для ўзаемадзеяння культур*

Культурны рэлятывізм як светапоглядная тэндэнцыя ў межах еўрапейскай культуры XIX–XX стст. Адлюстраванне ідэі мноства культур, шляхоў іх развіцця і каштоўнасных сістэм у працах Р. Бенедзікт, Ф. Боаса, М. Я. Данілеўскага, М. Мід, П. А. Сарокіна, О. Шпенглера і інш.

Погляды М.Херсковіца на агульны культурна-гістарычны працэс.

Самабытнасць культур як вызначальны прынцып культурнага рэлятывізму. Узроўні ўзаемадзеяння суб'ектаў розных культур.

### *Тэма 12. Дывергенцыя культур і шляхі яе пераадолення сродкамі дыялогу*

Фактары збліжэння і аддалення этнанацыянальных культур (геаграфічны, эканамічны, сацыяльна-палітычны, сацыякультурны і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інтэграцыя культур як вынік інтэнсіўнага дыялогу. Дыферэнцыяцыя культур і яе прычыны. Цэнтрабежны характар дыферэнцыяцыі культур. Супрацьлегласць кірункаў інтэграцыі і дыферэнцыяцыі.

Кантакты суб'ектаў этнічных культур з суб'ектамі іншых культур у межах свайго арэала.

Дэтэрмінанты інтэграцыі і дыферэнцыяцыі моў. Расшчапленне агульнаславянскай мовы ў I тысячагоддзі. Субстратныя, суперстратныя і адстратныя рысы мовы. Узаемадзеянне моў. Масавае і індывідуальнае двухмоў'е як вынік інтэрферэнцыі.

### *Тэма13. Канвергенцыя культур як вынік інтэнсіўнага дыялогу*

Паняцце «канвергенцыя». Інтэрпрэтацыя сутнасці канвергенцыі культур (Ф. Брадэль, А. Тойнбі, Л. Феўр). Праява падобных або аднолькавыхз'яў у культуры розных народаў, якія ўзнікаюць незалежна адзін ад аднаго. Культурныя межы і спосабы іх пераадолення. Канвергенцыя «ў глыбіню» і «ў шырыню». Ідэя «негатыўнай канвергенцыі» (Г. Маркузе, Ю. Хабермас, Р. Хейлбронер).

Культурная канвергенцыя як самаідэнтыфікацыя культуры, яе збліжэнне. Працэс выяўлення архетыповай сутнасці культуры ў працэсе канвергенцыі. Разгерметызацыя ўнутры- і міждысцыплінарных сегментаў культуры як задача канвергенцыі.

Якаснае ачышчэнне адзінай агульначалавечай культуры ў працэсе канвергенцыі.

### *Тэма 14. Формы і спосабы дыялогу*

Вербальныястасункі суб'ектаў розных культур. Усходняя і заходняя традыцыя вербальнай інфармацыі.Формы вербальных зносін (маналог, дыялог, палілог). Стылі вербальных зносін (прамы, вычварны, сціслы, інструментальны, афектыўны). Кантэксты вербальных зносін (дэтанацыя, канатацыя, полісемія, сінанімія).

Паравербальныя сродкі зносін суб'ектаў розных культур: прасодыка, экстралінгвістыка, гукавыя модусы.

Невербальныя зносіны суб'ектаў розных культур. Формы і спосабы невербальных зносін: кінетыка, акулістыка; такесіка, сенсорыка, праксеміка, хранеміка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Коль-касць гадзін КСР | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| **Уводзіны** | 1 | | | |
| *Тэма 1.* Дыялог як падмурак гуманітарнай парадыгмы сучаснай культуры | 1 | 2 | 1 | ва |
| *Тэма 2.* Станаўленне парадыгмы цэласнасці культуры ў глабальных супярэчнасцях сусветнай культуры XX–XXI стст. | 2 | 2 | | |
| *Тэма 3.* Дыялог як з'ява і сутнасць | 2 | 2 | | |
| *Тэма 4.* Канцэпцыя дыялагічнага персаналізму М. Бубера | 1 | 1 | 1 | ва |
| *Тэма 5.* Рацыянальная прырода дыялогу У. Біблера | 1 | 1 | 1 | па |
| *Тэма 6.* Асновы тэорыі дыялагізму М. Бахціна | 1 | 1 | 1 | ва |
| *Тэма 7.* Асэнсаванне дыялогу ў катэгарыяльным аспекце М. Каганам | 1 | 1 | 1 | ва |
| *Тэма 8.* Культуралагічны сэнс дыялогу ў архетыпах дуады і трыяды | 2 | 1 | 1 | па |
| *Тэма 9.* Тыпалагічныя асаблівасці дыялагічных адносін у сістэме сусветнай культуры | 2 | 2 | | |
| *Тэма 10.* Узаемадзеянне нацыянальных культур у эпоху глабалізацыі | 2 | 2 | | |
| *Тэма 11.*Культурны рэлятывізм і яго значэнне для ўзаемадзеяння культур | 2 | 2 | | |
| *Тэма 12.*Дывергенцыя культур і шляхі яе пераадолення сродкамі дыялогу | 1 | 1 | 2 | р |
| *Тэма 13.* Канвергенцыя культур як вынік інтэнсіўнага дыялогу | 1 | 1 | 1 | ва |
| *Тэма 14.* Формы і спосабы дыялогу | 2 | 1 | 1 | т |
| **Усяго…** | **22** | **20** | **10** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура

*Асноўная*


*1.Бахтин, М. М.* Проблема текста в лингвистике, филологии и других гуманитарных науках. Опыт философского анализа / М. М. Бахтин // Бахтин, М. М. Литературно-критические статьи. – М. : Худож. лит., 1986.– С. 281–307.

*2.Библер, В. С.* Культура. Диалог культур (Опыт определения) / В. С. Библер // Вопросы философии. – 1989. – № 6. – С. 31–42.

*3.Бубер, М.* Я и Ты : пер. с нем. / М. Бубер. – М. : Высш. шк., 1993. – 176 с.

*4.Грушевицкая, Т. Г.* Основы межкультурной коммуникации : учебник для вузов / Т. Г. Грушевицкая, В. Л. Попков, А. П. Садохин ;ред. А. П. Садохин.– М. : ЮНИТИ-ДАНА, 2002. – 352 с.

*5.Гудков, Д.* Теория и практика межкультурной коммуникации / Д. Гудков. – М. : Политиздат, 2003. – 187 с.

*6.Гумилев, Л. Н.* Этногенез и биосфера Земли / Л. Н. Гумилев. – М. : ДИ-КАРТ, 1993. – 503 с.

*7.*Диалог и коммуникации: философские проблемы (материалы круглого стола) // Вопросы философии. – 1989. – № 7. – С. 3–27.

*8.Драгунский, Д.* Культура как диалог / Д.Драгунский // Диалог в культуре. – М.: Наука, 1989. – Вып. 5. – С. 6–8.

*9.Каган, М.С.* Мир общения: проблема межсубъектных отношений / М.С.Каган. – М.: Политиздат, 1988. – 319 с.

*10.Карсавин, Л.П.* Философия истории / Л.П.Карсавин. – СПб.: Комплект, 1993. – 350 с.

*11.*Коммуникация и диалог в культуре / К.Г.Антонов, Т. В. Артемьев, В.А.Белоус [и др.]// Культурология: учебник для студ. учреждений высш. проф. образования; под ред. Л. М. Мосоловой. – М.: Академия, 2013. – С. 108–117.

*12.Лотман, Ю.М.* Культура и взрыв / Ю. М. Лотман. – М.: Наука, 1992. – 210 с.

*13.Почепцов, Г. Г.* Теория коммуникаций / Г.Г.Почепцов. – М.: Рельеф-бук, 2001. – 656 с.

*14.Садохин, А.П.* Межкультурная коммуникация / А. П. Садохин. – М.: Альфа-М, 2006. – 287 с.

*15.*Суб'екты культуры /А.І.Смолік,Л.К.Кухто// Смолік, А.І. Культуралогія: тэорыя культуры: вучэб. дапам. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. –С. 195–206.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16.Харрис, Р.* Психология массовых коммуникаций / Р. Харрис. – СПб.: НЕВА, 2002. – 546 с.

*Дадатковая*

*1.Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: дасьледзіны беларускага светапогляду / І.Абдзіраловіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

*2.Артановский, С.Н.* На перекрестке идей и цивилизаций: исторические формы общения народов. Мировые культурные контакты. Многонациональное государство / С.Н.Артановский. – СПб.: С.-Петерб. гос. акад. культуры, 1994. – 432 с.

*3.Бубер, М.* Проблема человека / М.Бубер // «Я и Ты». – М. : Высш. шк., 1993. – 176 с.

*4.Волошок, В.В.*Модели коммуникации как формы организации социального опыта / В.В. Волошок // Вестн. Могилев. гос. ун-та им. А.А.Кулешова. – 2001. – № 1. – С. 12–16.

*5.Данилевский, Н.Я.*Россия и Европа / Н.Я.Данилевский. – М.: Ин-т русской цивилизации: Благославение, 1991. – 816 с.

*6.Кристева, Ю.* Бахтин, слово, диалог и роман / Ю.Кристева //Диалог. Карнавал. Хронотоп. – 1993. – № 4. – С. 6–7.

7.Кризис современной цивилизации: Выбор пути:сб. обзоров / под ред. Ф.И.Жиренко, Л.И.Василенко. – М.: ИНИОН РАН, 1992. – 124 с.

*8.Лихачев, Д.С.* Два типа границ между культурами / Д. С. Лихачев // Русская литература. – СПб. – 1995. – № 3. – С. 4–6.

*9.Померанц,Г.С.*Диалог и молчание / Г.С.Померанц // Человек. – 1996. – № 3. – С. 60–64.

*10.Сащеко, В.В.* Предпосылки диалогизма: Историко-культурный обзор / В.В. Сащеко // Вестн. мол. науч. об-ва. – 2004. – № 4. – С. 74–76.

*11.Спирина, Е.А.* Мультикультурализм как стратегия взаимодействия этнокультурных групп / Е.А.Спирина. – Минск: РИВШ, 2012. – 223 с.

*12.Суша, А.А.* Дыялог «Усход – Захад» у гісторыі хрысціянства ў Беларусі / А.А.Суша // Религия и общество: актуальные проблемы современного религиоведения: сб. науч. тр. / под общ. ред. В.В.Старостенко. – Могилев: МГУ им. А.Кулешова. – С. 258–261.

**Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння праблем сацыякультурнай практыкі, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
– праектныя тэхналогіі;
– камунікатыўныя тэхналогіі;
– гульнявыя тэхналогіі;
– метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання неабходнай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У якасці аднаго з элементаў выяўлення вучэбных дасягненняў студэнта магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльна-арыенціраваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным альбо некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух варыянтаў з адным альбо некалькімі суадносінамі і роўнай альбо рознай колькасцю элементаў і варыянтаў; заданняў адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

Для вызначэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта па патрабаваннях адукацыйнага стандарту таксама магчыма выкарыстоўваць праблемныя, творчыя заданні, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Роля і месца самастойнай работы ў вучэбна-выхаваўчым працэсе УВА вызначаецца сучаснымі патрабаваннямі да выпускніка, неабходнасцю павышэння якасці адукацыі і адначасова змяшчэння часу, энерга- і працазатрат выкладчыка і студэнта на падрыхтоўку да традыцыйных лекцыйных, семінар-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скіх, практычных і іншых заняткаў, патрабаваннямі да ўваходжання ў сусветную адукацыйную прастору. Усёгэтаўплывае на вызначэнне статусусамастойнай работы студэнтаў як абавязковагабазавагаэлемента прафесійнай падрыхтоўкі.

Для павышэння эфектыўнасці СРС неабходна прытрымлівацца наступных рэкамендацый:

– вызначыць у пачатку семестра найбольш ключавыя тэмы фундаментальнай культуралогіі, якія садзейнічаюць фарміраванню прафесіянальнай і асобаснай кампетэнтнасці спецыяліста;

– правільна арганізаваць самастойную работу;

– ажыццяўляць сістэматычны міжсесіённы кантроль за СРС і кіраўніцтва ёю;

– стварыць спрыяльныя ўмовы для яе здзяйснення;

– рэкамендаваць неабходную вучэбную, навуковую літаратуру, перыядычныя выданні культуралагічнага профілю;

– праводзіць пры неабходнасці кансультаванне і карэкцыю памылак студэнтаў, якія дапускаюцца ў працэсе самастойнага вывучэння вызначаных тэм;

– падвесці вынікі самастойнага засваення студэнтамі пытанняў вызначаных тэм, выкарыстоўваючы розныя формы кантролю (тэсты, калёквіумы, сціслыя пісьмовыя работы, прэзентацыі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ДЫЯЛОГ КУЛЬТУР У КАНТЭКСЦЕ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 01-01 Культуралогія*
*(фундаментальная), спецыялізацыі*
*1-21 04 01-01 01 Тэорыя і гісторыя культуры*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60х84$^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,99. Ул.-выд. арк.0,64. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ